Таким образом, описанные выше сабли из коллекции Национального исторического музея, являются прекрасной иллюстрацией к историческим событиям позднего периода правления Александра I. Этот период отличался в определенной степени либеральным отношением к подвластным Российской империи народам, а Отдельный литовский корпус, созданный российским императором, походил на национальную армию бывшего Великого княжества литовского.


1. Кулинский, А. Н. Русское холодное оружие военных, морских и гражданских чинов / А. Н. Кулинский. – С-Пб. : Магик-пресс, Олимп, 1994 – 183 с.
2. Стихина, И. А. Влияние исторических эпох на развитие оружейного производства и златоустовской гравюры на стали (Златоустовская оружейная фабрика) [Электронный ресурс] / И. А. Стихина, Е. И. Горобец // Вестник Прикамского социального института. – 2017. – № 1 (76) – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/vliyanie-istoricheskih-epoh-na-razvitie-oruzheynogo-proizvodstva-i-zlatoustovskoy-gravyury-na-stali-zlatoustovskaya-oruzheynaya/viewer. – Дата доступа: 20.09.21.
3. Федоров, В. Г. Холодное оружие/ В. Г. Федоров. – М . : Яуза ; Эксмо, 2010 – 288 с.
4. Леонов, О. Строевое холодное оружие русской армии и флотаю 1700–1881 гг. / О. Леонов, А. Устьянов – М. : Фонд «Русские витязи», 2017. – 496 с.
5. Некрашевич, Ф. А. Участие Отдельного Литовского корпуса в подавлении восстания 1830–1831 гг. / В. А. Некрашевич // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 9 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БДУ, 2014. – С. 86
6. Некрашевич, Ф. А. Отдельный Литовский корпус: создание, структура, деятельность (1817–1831 гг.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 07.00.02 [Электронный ресурс] / Ф. А. Некрашевич ; Белорусский государственный университет. – 2016 – Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/165827. – Дата доступа: 20.09.21.


**Дашкевіч А. Л.**

## УДЗЕЛ ГРАМАДСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ У АХОВЕ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: АСОБНЫЯ АСПЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ КАНСТЫТУЦЫЙНА-ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ

***Ключавыя словы:*** грамадскае фарміраванне, грамадскае аб’яднанне, орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, дзяржаўны орган, гісторыка-культурная спадчына, канстытуцыйна-прававое рэгуляванне.

У сучасных умовах пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны ўсё выразней набываюць вагу не толькі ў дачыненні духоўна-культурнай сферы, але і адносна вырашэння пытанняў сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага характару. Развіццё суверэннай беларус-

кай дзяржавы патрабуе эфектыўнага канстытуцыйна-прававога рэгулявання аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Важным элементам якога з’яўляецца ўдзел грамадскіх фарміраваняў у ахове гісторыка культурнай спадчыны, забеспячэнні яе выкарыстання ў турыстычнай, адукацыйнай, выхаваўчай, ідэалагічнай і іншай дзейнасці. У гэтым кантэксце можна пагадзіцца з меркаваннем, што грамадскі ўдзел у сферы аховы і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны ўяўляе сабой прэвентыўны спосаб абароны сацыяльных інтарэсаў, форму ўдзелу грамадзян у кіраванні справамі дзяржавы, сродак выяўлення і ўзгаднення інтарэсаў насельніцтва з іншымі грамадскімі, дзяржаўнымі і прыватнымі інтарэсамі [5, с. 17].

На канстытуцыйным узроўні (артыкулы 15, 54) замацавана, што дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, адначасова на кожнага чалавека ўскладаецца абавязак берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці [4]. У свой час мы звярталі ўвагу на тое, што тэрмін “духоўная спадчына”, які выкарыстоўваецца ў Канстытуцыі разам з паняццем гісторыка-культурнай спадчыны, не атрымаў свайго асобнага тлумачэння ў заканадаўстве [2, с. 209-210]. Гэта сітуацыя захоўваецца і зараз. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры ў пункце 1 артыкула 82 прадугледжваецца, што гісторыка-культурная спадчына ўяўляе сабой сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях [3]. Прыведзенае азначэнне цалкам супадае з паняццем, якое падавалася раней у артыкуле 1 Закона Рэспублікі Белрусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” (не дзейнічае з 3 лютага 2017 года) [1]. Аналіз яго зместу дае падставы зрабіць выснову аб сумежнасці тэрмінаў “гісторыка-культурная спадчына” і “духоўная спадчына” у дачыненні адметных вынікаў і сведчанняў духоўнага развіцця Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях. Пры гэтым выразнага азначэння паняцця духоўнай спадчыны, як і раней, у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры не падаецца, нягледзячы на яго канстытуцыйны ўзровень. Адпаведна, па нашаму меркаванню, для забеспячэння аднастайнасці ў межах тэрміналагічнага апарату, правапрымяняльнай практыкі, існуе неабходнасць легальнага вызначэння зместу паняцця духоўнай спадчыны ў межах Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Асноўныя правамоцтвы грамадскіх фарміраванняў у дачыненні іх удзелу ў ахове гісторыка-культурнай спадчыны, накіраваныя на забеспячэнне выканання канстытуцыйных палажэнняў, утрымліваюцца ў іншых нарматыўных прававых актах, найперш у Кодэксе Рэспублікі

Беларусь аб культуры, дзе ў артыкуле 15 падаюцца суб’екты ўзаемадзеяння ў сферы культуры [3]. Разам з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і грамадскімі аб’яднаннямі, пералік такіх суб’ектаў утрымлівае ўказанне, што ў такой якасці выступаюць і іншыя юрыдычныя асобы. Адпаведна да суб’ектаў узаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі ў галіне культуры, у тым ліку аховы гісторыка-культурнай спадчыны, могуць быць аднесены ўсе віды грамадскіх фарміраванняў, якія з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, а таксама органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, якія могуць і не мець такога статуса.

Асобнае месца ва ўзаемадзеянні грамадскіх фарміраванняў і дзяржаўных органаў займае грамадскі кантроль у сферы культуры, які датычыцца гісторыка-культурнай спадчыны. Так, паводле артыкула 20 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры грамадскі кантроль у сферы культуры ажыццяўляецца ў мэтах забеспячэння выканання патрабаванняў: ахоўных абавязацельстваў; рэжымаў утрымання і выкарыстання зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; аб абмежаванні правоў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць; аб усталяванні на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях ахоўных дошак; да выканання работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях [3].

Да прыняцця Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і адпаведнай пастановы ўрада, дзейнічала пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 кастрычніка 2008 г. [3, 6, 7]. Прадугледжвалася, што ажыццяўленне грамадскага кантролю адбываецца шляхам удзелу прадстаўнікоў рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў у складзе грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Пры гэтым ажыццяўленне грамадскага кантролю ўскладалася на членаў камісіі. Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад назіральнай камісіі маглі зарэгістраваныя ва ўстаноўленным парадку рэспубліканскія грамадскія аб’яднанні, мэтай ці прыярытэтным накірункам дзейнасці якіх з’яўлялася ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Адпаведна суб’ектам, які мае права на грамадскі кантроль з’яўлялася назіральная камісія і толькі апасродкавана (праз сваіх членаў, якія ўваходзілі ў склад камісіі) рэспубліканскія грамадскія аб’яднанні. Тым самым звужаўся пералік грамадскіх аб’яднанняў, якія могуць прымаць удзел у грамадкім кантролe, праз выключэнне міжнародных і мясцовых аб’яднанняў.

У дзеючым заканадаўстве такія абмежаванні не прысутнічаюць (артыкул 20 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры [3]). Грамадскі кантроль у сферы культуры ўскладзены на грамадскія назіральныя камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, якія ствараюцца не толькі пры Міністэрстве культуры, але і пры мясцовых выканаўчых і распарадчых органах абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў. У склад грамадскіх назіральных камісій па ахове гісторыка-культурнай спадчыны могуць уваходзіць прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў у сферы культуры, якія займаюцца пытаннямі гісторыка-культурнай спадчыны, разам з прадстаўнікамі дзяржаўных органаў, пры якіх яны створаны. Пры гэтым захоўваецца апасродкаваны характар удзелу грамадскіх аб'яднанняў у грамадскім кантроле праз сваіх прадстаўнікоў, якія ўваходзяць у склад адпаведных камісій.

Падсумоўваючы адзначым магчымасць удасканальвання выкарыстання паняцця духоўнай спадчыны ў заканадаўстве. Для забеспячэння аднастайнасці ў межах тэрміналагічнага апарату, адпаведнай праваprымяняльнай практыкі, можна прапанаваць легальна вызначыць яго змест у межах Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Па нашаму меркаванню, улічваючы, у тым ліку, значнасць пытання аховы гісторыка-культурнай спадчыны, прысутнічае магчымасць пашырэння кола суб'ектаў, якія вылучаюць сваіх прадстаўнікоў у склад грамадскіх назіральных камісій за кошт іншых відаў грамадскіх фарміраванняў, якія дзейнічаюць у галіне культуры, што ўжо прадугледжана ў дачыненні ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі.


1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь [Электронный ресурс] : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.
2. Дашкевіч, А.Л. Грамадскія аб'яднанні і ахова гісторыка-культурнай спадчыны: канстытуцыйна-прававы аспект / А.Л. Дашкевіч // Конституция Республики Беларусь: 16-летний опыт применения. Материалы круглого стола, состоявшегося 15 марта 2010 года на юридическом факультете Белорусского государственного университета / науч. ред. Г.А. Василевич / Белгосуниверситет. – Минск: Право и экономика, 2010. – С. 209–213.
3. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронный ресурс] : 20 ліп. 2016 г. № 413-З: прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэспублікі 30 чэрв. 2016 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.
4. Конституция Республики Беларусь [Электронный ресурс]: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.
5. Мартыненко, И.Э. Взаимодействие институтов гражданского общества региона с государственными органами правоохранения и контроля в сфере историко-культурного наследия / И.Э. Мартыненко // Белорусская политология : многообразие в единстве. Политическое знание в современном социальном и

образовательном пространстве : тезисы докладов V международной научно-практической конференции, Гродно, 17 - 18 мая 2012 г. В 2 ч. Ч. 2 / Учреждение образования "Гродненский государственный университет имени Янки Купалы" ; ред. кол.: [и др.], В. Н. Ватыль. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 16–19.
6. О некоторых мерах по реализации Кодекса Республики Беларусь о культуре [Электронный ресурс] : Постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 13 янв. 2017 г., № 25 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.
7. Об утверждении Положения о порядке осуществления общественными объединениями общественного контроля за исполнением законодательства Республики Беларусь об охране историко-культурного наследия [Электронный ресурс] : Постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 22 окт. 2008 г., №1570 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.

**Дубатоўка М. А.**

## КАШТОЎНАСЦІ МІНСКАГА АРХІЕРЭЙСКАГА ДОМА Ў 1812 ГОДЗЕ

***Ключавыя словы:*** гісторыка-культурная спадчына, гісторыка-культурная каштоўнасць, мінскі архіерэйскі дом, 1812 год.

Падчас падзей 1812 года ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі была акупавана французскімі войскамі. Горад Мінск не быў выключэннем і зведаў свае страты ад вайны, стаўшы цэнтрам Мінскага дэпартаменту - адміністарцыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, створанай французскімі ўладамі на месцы Мінскай губерніі падчас акупацыі. Ахвярай канфлікту стала і Мінскае архіерэйскіае падвор’е - месца жыхарства праваслаўнага епіскапа, главы Мінскай епархіі. Сакральныя рэчы з царквы на падвор’і, як і начынне непасрэдна дома архіерэя, выкарыстоўваліся ўдзельнікамі канфлікту па сваім уласным жаданні, а судовыя разбіральніцтвы па гэтай справе цягнуліся чвэрць стагоддзя.

Вывучэннем дзейнасці Мінскага дэпартаменту пачалі займацца яшчэ за часамі Расійскай імперыі [2]. Сёння гэтай тэме прысвечаныя работы як некаторых айчынных [1, 7], так і замежных гісторыкаў [14]. Да пытанняў лёсу сакральнай спадчыны ў французска-рускай вайне 1812 года звяртаюцца нешматлікія айчынныя даследчыкі. Сярод такіх можна вылучыць артыкулы Ю. І. Літвіноўскай [5] і Л. М. Лісавай [3, 6]. У гэтых працах аўтары разглядаюць становішча каштоўных храмавых рэчаў у вайне, аднак даюць агульны агляд пытання без падрабязнасцяў вывазу ці знікнення прадметаў храмавага начыння. Падзеі ў Мінскім архіерэйскім доме імі таксама закранаюцца, аднак у рэчышчы агульных тэндэнцый лёсу храмаў у 1812 годзе.